протяжении XVIII – первой половины XIX в. постепенное усовершенствование формы и наполнение содержания данного вида документа позволяло наемным иноземцам в спорных ситуациях легче апеллировать к контракту, т.к. он укреплялся как гарант их социально-правового статуса. Договоры с иностранцами выступают источниками по социальной истории, если иметь в виду контрактуемых как социальную общность. Контракты обладают и богатым потенциалом для историко-антропологических изысканий, поскольку отражают отношение государства к личности, свидетельствуют о готовности (или неготовности) государства к диалогу с человеком, позиции государства в том, считаться с гражданскими правами или игнорировать их.

1. Государственный архив Свердловской области (ГАСО). – Ф. 24. Оп. 1. Д. 1253.
2. ГАСО. – Ф. 24. Оп. 12. Д. 33.
3. ГАСО. – Ф. 24. Оп. 32. Д. 782.
4. ГАСО. – Ф. 43. Оп. 1. Д. 8.
5. Книга Устав морской: о всем, что касается доброму управлению, в бытности флота на море. – Санкт-Петербург : при Императорской Академии наук, 1778. – 298 с.
6. Кортина, С. Б. Немецкие специалисты на Урале в XVIII веке / С. Б. Кортина, А. В. Наймушин, А. В. Черноухов // Документ. Архив. История. Современность. – Екатеринбург, 2003. – Вып. 3. – С. 88-99.
7. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 37. Оп. 11. Д. 63.
8. Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Ф. 271. Оп. 1. Кн. 68.
9. Центральный государственный архив Удмуртской республики (ЦГА УР). – Ф. 212. Оп. 1. Д. 742.

**Сакольчык А.Э.**

## КРЫНІЦЫ ПА КАНФЕСІЙНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

Працуючы ў рамках дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў па канфесійнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі выяўлены надзвычай багаты фактаграфічны матэрыял. Ён базіруецца на шырокай палітры гістарычных крыніц, геаграфічны спектр якой ахоплівае традыцыйна выкарыстоўваемыя тэматычныя дакументальныя зборы Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродна, а таксама вузкаспецыялізаваныя (архіў місіянераў у Кракаве на Страдаме, архіў Правінцыі Паўднёвай Польшчы ксяндзоў езуітаў у Кракаве і інш.).

У корпусе выяўленых пісьмовых матэрыялаў можна вылучыць некалькі групаў (па відавых найменнях): заканадаўчыя і нарматыўна-прававыя акты; матэрыялы справаводства; дакументы асабістага паходжання; уласна духоўна-рэлігійная (царкоўная) прадукцыя; перыядычныя выданні.

Заканадаўчыя і нарматыўна-прававыя акты. Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ўрад Расійскай імперыі сутыкнуўся са складанымі ўзаемаадносінамі паміж канфесіямі гэтай тэрыторыі. Яны патрабавалі пастаяннага ўмяшальніцтва на вышэйшым узроўні і адпаведных заканадаўчых крокаў. У выніку на працягу XIX – пачатку XX ст. была выпрацавана значная колькасць заканадаўчых актаў, якія выдаваліся ў выглядзе тэматычных зборнікаў дакументаў і ўключаліся ў спецыяльныя юрыдычныя працы [1, 2, 3, 4]. Гэтыя заканадаўчыя зборы ўтрымоўваюць царскія маніфесты, імянныя ўказы, загады і наказы, якія вызначалі статус царквы розных канфесій, яе кіраванне, правядзенне царкоўных рэформаў, прававое становішча духавенства. У цэлым, яны характарызуюць законатворчую дзейнасць органаў дзяржаўнай улады ў сферы рэлігійных адносінаў фармату дзяржава – царква – вернікі і міжканфесійных зносін па мадэлі царква/царква – вернікі/вернікі.

Аналіз практычнай рэалізацыі ўрадавых законаў на месцах ажыццёўлены на падставе дакументальных калекцый айчынных (мясцовых) архівасховішчаў. Менавіта яны скамплектавалі самую масавую групу даследаваных тэматычных крыніц – матэрыялаў справаводства. Па функцыянальнаму прызначэнню дакументаў у ёй змяшчаецца шэраг падгруп (распараджальная, справаздачная дакументацыя; дзелавая перапіска; уліковыя дакументы; судова-следчыя справы).

У падгрупе распараджальнай дакументацыі неабходна размяжоўваць два яе змястоўна розныя напрамкі: матэрыялы цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады Расійскай імперыі і матэрыялы органаў царкоўнага кіравання.



Рэпазіторый ВГУ

Першы напрамак прадстаўлены цыркулярамі, распараджэннямі, прадпісаннямі, аб'явамі і інструкцыямі ўзроўню міністэрства ўнутраных спраў, генерал-губернатарства, павятовага кіраўніцтва. Іх інфармацыйны патэнцыял раскрывае, так званы ўнутраны свет створанай заканадаўчай прасторы, адказваючы на пытанне – наколькі магчыма было прывесці ў жыццё тое ці іншае мерапрыемства, зыходзячы з асаблівасцяў функцыянавання беларуска-літоўскіх губерняў. Ступень рэалізацыі гэтых нарматыўных практык выклікала шэраг карэктуючых, дапаўняльных, удакладняльных прадпісанняў больш дробнага або прыватнага характару для вырашэння пытанняў "на месцы": абгрунтаванне і арганізацыя царкоўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры розных канфесій (уладкаванне або заснаванне парафій, прыходаў, брацтваў, культавае будаўніцтва і г.д.); фінансавае забеспячэнне іх жыццядзейнасці; рэгуляванне міжканфесійных пераходаў (што тычылася галоўным чынам хрысціянскіх канфесій), "змешаных" шлюбаў (што суправаджалася і абцяжарвалася ломкай традыйных уяўленняў), дыялогу хрысціянскіх і нехрысціянскіх канфесій; абмежаванне палітычнай дзенасці прадстаўнікоў духоўнага сану.

Другі напрамак уключае папскія энцыклікі і біскупскія пасланні, булы, інструкцыі, дакументы Ватыкана, пастановы сабораў і дакументы касцёльнага права [5], мемарандумы, звароты, заключэнні кансісторый, рашэнні Св. Сінода, уставы і статуты брацтваў, дабрачынных таварыстваў [6] і г. д. (большасць з іх апублікавана ў тэматычных зборніках дакументаў). Тут акрамя раскрыцця галоўных рыс унутранага царкоўнага жыцця, магчыма прасачыць пазіцыю царкы і яе рэакцыю на рэлігійную палітыку дзяржавы, іх узаемаадносіны.

Справаздачныя дакументы з'яўляюцца памежнай групай, бо змяшчаюць не толькі тэкставую аналітычную частку заключэнняў справаздачнай асобы (губернатра, біскупа, святара і інш.) аб стане той ці іншай справы, але і статыстычна-ўліковыя звесткі ў выглядзе дадаткаў са спісаў і табліц. У першу чаргу да іх адносяцца штогадовыя справаздачы обер-пракурора Св. Сінода, што друкаваліся ў "Епархиальных ведомостях", штогадовыя агляды губернатараў, справаздачы кліра аб стане навучальных акругаў, школаў, працэсе навучання, пасяховасці навучэнцаў, справаздачы жаночых вучылішчаў, падпарадкаваных Св. Сіноду, брацтваў, епархіяльных вучылішчных саветаў, актамі візітацый і інвентарамі. У асноўным тут маюцца звесткі пра колькасць прадстаўнікоў розных канфесій у рэгіёне, пра працу святароў, іх дзейнасць, грамадскія і дабрачынныя арганізацыі, пра асветніцкую дзейнасць царквы і стан духоўнай адукацыі ў рэгіёне, вучэбна-выхаваўчы працэс, матэрыяльнае забеспячэнне устаноў. Напрыклад, унікальнымі ў інфармацыйным плане з'яўляюцца інвентары, якія апісваюць стан і забеспячэнне Полацкай езуіцкай друкарні [7, арк. 1–130 адв.], полацкага калегіўма езуітаў [8]. Каштоўным з'яўляецца таксама тое, што справаздачы епархіяльнага кіраўніцтва ўключаюць звесткі пра наведаныя ім падчас паездак па епархіі розныя населеныя пункты.

Але паколькі змест гэтых крыніц мае пераважна колькасныя характарыстыкі, то іх лагічна выкарыстоўваць і ў падгрупе ўлікова-статыстычных дакументаў. Дарэчы, дадзеная група сфарміравана таксама з шэрагу крыніц памежнага характару або двайной інфармацыйнай нагрузкі.

Акрамя вышэй пералічаных крыніц сюды аднесены апублікаваныя статыстычныя даведнікі ("Памятные книжки", "Первая всеобщая перепись населения" 1897 года, "Материалы для географии и статистики России"); ведамасці святароў са статыстычнымі звесткамі пра колькасць народжаных, узяўшых шлюб, памерлых і інш., фармулярныя спісы, пералікі вучняў, ведамасці/апісанні аб стане парафій/прыходаў, пабудоў (асабліва пасля вайны 1812 г.); алфавітныя спісы ўдзельнікаў паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг.

Сярод ведамасцяў рознага ўліку нойбольш інфарматыўнымі выступаюць ведамасці аб стане касцёлаў, філій і капліц. Яны запаўняліся па выпрацаваным фармуляры і ўключалі наступныя пазіцыі: колькасць парафій; назва парафіяльных касцёлаў і належачых да іх асобных алтарый, філій і капліц; колькасць святароў; час правядзення набажэнстваў; назвы населеных пунктаў, якія ўваходзяць у парафію; колькасць парафіян у кожным населеным пункце. Часам ведамасці фарміраваліся ў справу разам з копіяй указа аб зборы звестак і рапартамі дэканаў і святароў аб іх прадстаўленні.

З 1873 г. ведамасныя вопісы дапоўніліся пазіцыямі па плошчы касцёльнай зямлі; колькасці здадзенай у арэнду; імені арандатара; наяўнасці кантракту; характарыстыцы пабудоў і г.д. Унесеныя дапаўненні датычыліся гаспадарчай функцыі царквы (пераважна каталіцкай). Таму яны

Репозиторий ВГУ

фактычна аднесены ў асобную катэгорыю крыніц гаспадарчага парадку, разам з інвентарамі і рэвізіямі царкоўных угоддзяў з пералікам памеру зямлі, заняткаў і агульным эканамічным станам. Сюды ж уключаны завяшчанні свецкіх асоб аб перадачы/дараванні ў царкоўнае карыстанне маёмасці.

Уліковыя даныя знаходзім таксама ў фармулярных спісах, паслуговых спісах, пераліках вучняў, ведамасцях паспяховасці. Адначасова яны з'яўляюцца добрай асновай для аналізу біяграфічных даных пэўнага чалавека і грунтоўна дапаўняюць дакументы біяграфічнага тыпу (атэстаты, дыпломы, прысягі, назначэнні святароў на пасады або іх перавод, указы аб прысвойванні духоўнага звання і др.).

Праўда, фрагментацыя звестак, неахайнасць запаўнення, складанасць вызначэння спосабаў падліку выклікаюць асаблівае крытычнае стаўленне да дадзеных дакументальных матэрыялаў.

Віды крыніц дзелавой перапіскі прадстаўляюць рапарты, данясенні, прашэнні, даручальніцтвы, афіцыйныя лісты. Тэматыка службовай перапіскі звязана, у большасці сваёй, з запытамі і просьбамі ў МУС павятовых служачых, святароў або вернікаў на дазвол дзейнасці канкрэтнай установы/арганізацыі (брацтва, кляштара, школы, друкарні), вырашэння спрэчных маёмасных пытанняў, праблем з пераводамі ў іншае веравызнанне і з заключэннямі "змешаных шлюбаў".

Напрыклад, звяртае на сябе ўвагу тое, што любы факт непакоры ўніятаў беларуска-літоўскіх губерняў быў вядомы ў сталіцы імперыі і з'яўляўся прадметам абмеркавання ў Сінодзе. Найбольш значныя эксцэсы разглядаліся ў міністэрстве ўнутраных спраў, штабе корпуса жандараў і нават самім імператарам. А гэта надавала імпульс для стварэння крыніц вылучанага парадку і адпаведнага дакументазвароту.

Судова-следчыя справы, выкарыстаныя ў даследаванні, праходзяць па двух судовых сістэмах – крымінальнай і палітычнай. Першая, хаця і не такая масавая, але поўніцца шматграннымі фактамі: пра службовыя правіны прыхадскога духавенства, пра парушэнні законаў, звязаных з правіламі культавага будаўніцтва, абраннем служак культу, пра злачынствы на канфесійнай глебе (блюзнерствы, нараканні, невыкананне абрадавых патрабаванняў як вернікамі, так і духавенствам), пра зацвярджэнні да выканання натарыяльных і хатніх духоўных завяшчанняў, а таксама пра злачынствы ў сферы сямейных адносін. Таксама шмат якія пытанні супраціву дэунізацыі і «отпадения» экс-уніятаў ад пануючай веры (праваслаўная) разглядаліся ў судовым парадку. Судовыя справы палітычнага характару масава адносяцца да часоў паўстанняў 1830-х і 1860-х гг., якія, у першую чаргу, адбываліся над каталіцкімі святарамі і вернікамі за датычнасць да адзначаных рэалій. Следчыя матэрыялы паказваюць не толькі рэакцыю насельніцтва на пэўныя падзеі, іх грамадскую і палітычную пазіцыю, а таксама раскрываюць асаблівасці карнай сістэмы ўраду.

Дакументы асабістага паходжання складаюцца з мемуараў, дзённікаў, нататкаў іерархаў каталіцкага касцёла [9], сучаснікаў падзей [10], успамінаў немцаў-каланістаў [11], якія пражывалі ў пасяленнях на тэрыторыі Расійскай імперыі. Нягледзячы на значную долю суб'ектывізму, яны дапамагаюць глыбей пазнаць жывую атмасферу рэлігійнага жыцця, падрабязней пазнаёміцца з буднямі кліра, адчуць псіхалогію/настрой насельніцтва, дазваляюць ацаніць успрынянне канкрэтнымі асобамі працэсы, якія адбываліся ў грамадстве, даведацца пра місіянерскую, дабрачынную, выдавецкую, душпастырскую дзейнасць царквы, убачыць характарыстыку царкоўных дзеячоў, спецыфіку існавання пратэстанства ў Расійскай імперыі.

Прымяняльна да праблемы даследавання ў групу ўласна духоўна-рэлігійнай прадукцыі ўваходзяць тыя кнігі, канспекты, пастырскія лісты, звароты да насельніцтва і дапаможныя рэлігійныя прадметы, якія выходзілі з царкоўных друкарняў і забяспечвалі дагматычныя, духоўна-маральныя, ідэалагічныя асновы адукацыйна-выхаваўчага працэсу.

Вылучэнне групы перыядычных выданняў даволі ўмоўнае, бо яны змяшчаюць матэрыялы рознага зместу і жанру: ад заканадаўчых і справаздачных да публіцыстычных. Тут сустракаюцца грамадска-палітычныя, культурныя і царкоўныя выданні ("Русский архив", "Русская старина", "Губернские ведомости", "Епархиальные ведомости"). Свецкая прэса дэманструе цэлы спектр меркаванняў, якія існавалі ў расійскім грамадстве вывучаемага перыяду ў стаўленні да рэлігійнай палітыкі дзяржавы і міжканфесійных адносін. Царкоўная перыёдыка паказвае стаўленне супрацьлеглага боку (царквы і яе служачых) на шматлікія спробы рэфармавання канфесійнага жыцця краіны, чым стварае цэласны акцэнт дыялогу: дзяржава – царква – грамадства.



Рэпазіторый ВДУ

Такім чынам, наяўная база крыніц шырокая і разнастайная па свайму складу. Яна адлюстроўвае розныя бакі не толькі рэлігійнага, але і сацыяльнага жыцця: адносіны царквы і вернікаў з дзяржавай, канфесійныя кантакты насельніцтва і царквы, узаемасувязь этнічнай і канфесійнай самасвядомасці. Выяўлены комплекс стварае дастатковую дакументальную аснову для рэпрэзентатыўнасці заключэнняў і навукова-абгрунтаваных высноў, у першую чаргу, пры раскрыцці мясцовай спецыфікі канфесійнага жыцця і дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы.

1. Полное собрание законов Российской империи : Собр. 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г. : в 45 т. – СПб., 1830–1849; Собр. 2-е с 12 декабря 1825 г.: в 55 т. – СПб., 1830–1885.
2. Леванда, В. О. Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от Уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени / В. О. Леванда. – СПб. : Тип. К.В.Трубникова, 1874. – 1184 с.
3. Климов, Н. Ф. Постановление по делам православной церкви и духовенства в царствование императрицы Екатерины II: / Н. Ф. Климов – СПб. : Лештуковская паровая скоропечатня, 1902. – Вып. 1. – 161 с.
4. Белоголов, И. Акты и документы, относящиеся к устройству и управлению римско-католических церквей в России : в 2 т. Т. 1. / И. Белоголов. – Петроград : Типография Д.А. Алексеева, 1915. – 522 с.
5. Dokumenty Soborów Powszechnych : w 5 t. T. IV: 1511–1870 (Lateran V, Trydent, Watykan I); układ i opracowanie ks. A. Baron, H. Pietras. – Kraków: Wyd. WAM, 2004. – 867 s.
6. Ustawy Towarzystwa dobroczynności w Mińsku // Dzieje dobroczynności. – 1820. – Rok 1. – С. 348–358.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 139.
8. Historia Collegii Polocensis Societatis Jesu. Rok 1786–1817 // APPPTJ. – Rkps. 845 – II.
9. Valančius, M. Namų užrašai / M. Valančius. – Vilnius: Baltos lankos, 2003. - 933 s.
10. Bojanowski, E. Dziennik. 1853–1871 / E. Bojanowski. – Warszawa: PAX, 1999. – 350 s.
11. Галлер, П. К. Воспоминания П. К. Галлера / П. К. Галлер. – Саратов : Н-Волжское обл. научное об-во краеведения, 1927. – 48 с.

**Литвинчук Ю.С.**

## КАРТОГРАФИЧЕСКИЕ ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ ГОРОДОВ БЕЛАРУСИ КОНЦА XVIII – НАЧАЛА XX в. ИЗ ФОНДОВ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХИВА НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОЙ ДОКУМЕНТАЦИИ

История городов всегда находилась в центре внимания исследователей. Ею интересовались в первую очередь архитекторы, краеведы, художники и литераторы. Историки активно подключились к анализу данного проблемного поля лишь в конце XX в. Правда, на сегодняшний день изучение проблем урбанистики является одним из приоритетных направлений в белорусской историографии. Как известно, для объективного и полноценного раскрытия ряда исторических вопросов как вообще, так, в частности, и по истории городов, необходимо привлечение широкого круга источников. На данный момент ведущими специалистами-урбанистами задействован обширный комплекс документальных материалов. Однако, исследование изобразительных источников досканально было проведено в основном архитекторами, такими как, Ю.В. Чантурия, Т.И. Чернявская и др. В этой связи, обращение к изучению изоматериалов в историческом ракурсе является актуальным, впрочем, так же как и поиск местонахождения данного вида источников. Примечательно, что изобразительные источники по урбанистике Беларуси конца XVIII – начала XX в., в частности изобразительно-графические, находящиеся в фондах Белорусского государственного архива научно-технической документации (БГАНТД), мало исследованы учеными.

Особый интерес для урбанистов представляет шестой фонд архива «Коллекция планов и схем городов Беларуси», который объединяет 31 дело в одной описи (№ 2). Опись № 2 составлена на документальные материалы, принятые от Государственного комитета Совета Министров БССР по делам строительства (Госстрой БССР) и включает документы с 1748 по 1967 г.

По рассматриваемой проблеме выявлены изобразительные источники: планы и чертежи городов Велиж (1778 г.) [1, д. 1, л. 1], Минск (1783 г., 1793 г., 1797 г.; 1793 г. – чертеж Ю.Н. Кнороза 15 декабря 1982 г.; 1858 г.; второй четверти XIX в. – чертеж Ю.Н. Кнороза 1982 г.; 1896 г.; 1898 г.); планы центрального района города Минска (1800 г. – чертежи Ю.Н. Кнороза 1976 г.) [1, д. 8, л. 1–3; д. 14, л. 1–3; д. 15, л. 1–3; д. 24, л. 1; д. 29, л. 1, 2]; Гродно (без даты), Витебск (1904 г.) [1, д. 28, л. 1], а также проектная документация – планы губернского города Минска 1910, 1911 гг. [1, д. 6, л. 1, 2; д. 7, л. 1, 2; д. 9, л. 1–4; д. 13, л. 1–3].

Изобразительные источники – это особенный, специфический тип исторических источников, который отражает историческую действительность, достоверность в визуальном контексте. В типологической классификации исторических источников, предложенной С.О. Шмидтом, среди изобразительных источников, выделяются следующие: художественно-изобразительные



Репозиторий ВГУ